На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Народная Воля

№№68–69
(3198–3199)

4—6 мая 2010 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Хто расколвае Партыю БНФ?

Напярэдадні пазачарговага з'езда Партыю БНФ ізноў заліхаманіла. Шэраг вядомых партыйцаў выступіў з рэзкай крытыкай новага кіраўніцтва.

Зварот у рэвізійную камісію накіравалі 19 партыйцаў, якія, без перабольшвання, непарыўна звязаны з Фронтам: Вацлаў Арэшка, Леанід Аўтухоў, Лявон Баршчэўскі, Мікола Бусел, Уладзімір Вялічкін, Вінцук Вячорка, Сяргей Гоўша, Віктар Івашкевіч, Алесь Мех, Валянціна Свяцкая, Юрый Хадыка.

"Мінула больш за паўгода ад папярэдняга з'езда Партыі БНФ і змены яго палітычнага курсу. Мы змушаны канстатаваць: Партыя БНФ зараз паступова сыходзіць з палітычнага жыцця Беларусі. Відавочна, што і ў найбліжэйшай прэзідэнцкай кампаніі кіраўніцтва БНФ не мае намеру забяспечыць рэальны ўплыў партыі на беларускую дэмакратычную палітыку", — адзначаецца ў заяве".

(Падрабязней у наступным нумары.)

ТУРЫСТЫЧНАЕ АГЕНЦТВА «ГІСТОРЫЯ-ТУР»
Тур на фестываль "Дударскі Фэст" (15.05.2010, Дудуткі)!
Тур на фестываль "Навагрудскі замак" (26-27.06.2010, Навагрудак)!
Тур «Шлях на Грунвальд»: Підзборг - Зарыінскі - Ольштын - Мальборк - Грунвальд (13-18.07.2010, Польшча)!
(029) 677 00 46 www.h-t.by
[illegible]

АКТУАЛІІ

«Чорныя вораны»

Знікаюць людзі… У ХХІ стагоддзі, у еўрапейскай краіне, якая паводле Канстытуцыі з'яўляецца дэмакратычнай, прававой і вельмі цывілізаванай, адбываюцца падзеі, што вельмі нагадваюць сумнавядомы 1937 год. І на ўсіх узроўнях — цішыня, нібы так і павінна быць.

Ужо больш за месяц нічога не вядома пра лёс старшыні Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Аркадзя Карпуця. Другая асоба ў вобласці, член Савета Рэспублікі… Але ў адзін не самы лепшы дзень на працу высокі чыноўнік не з'явіўся, знік, растварыўся ў часе і ў прасторы. Пра лёс гэтага чалавека, які яшчэ нядаўна ўвасабляў сабой мясцовую ўладу, афіцыйна не сказана ні слова. Чуткі ходзяць самыя розныя. Ніхто іх не абвяргае, але і не пацвярджае. Такія ў нашай краіне зараз правілы.

Прайшлі выбары ў мясцовыя Саветы. Аркадзь Карпуць як былы старшыня Берастаўіцкага райвыканкама традыцыйна менавіта там балатаваўся і абіраўся на другую пасаду ў вобласці. І на гэтых выбарах спачатку ўсё сведчыла пра тое, што шматгадовы старшыня аблсавета захавае свой партфель дзякуючы выбаршчыкам з Берастаўіцы. Ён нават быў зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты па Берастаўіцкай выбарчай акрузе №18, але як толькі Карпуць раптам не дайшоў да свайго працоўнага кабінета — знікла і ягонае прозвішча з перадвыбарных спісаў. Зразумела, што патлумачыць што-небудзь выбаршчыкам ніхто не палічыў неабходным. Вісеў партрэт славутага земляка ў раённай бібліятэцы — раптам знялі са сцяны і з усіх спісаў выкраслілі. Чаму, за што?.. Не ваша справа!

Тым часам відавочцы расказваюць, што Аркадзя Карпуця арыштавалі прама на плошчы Леніна перад будынкам Гродзенскага аблвыканкама нейкія невядомыя ў цывільным. Неафіцыйна абласныя чыноўнікі сцвярджаюць, што арыштоўваў рэспубліканскі Камітэт дзяржбяспекі. Сенатара і старшыню аблсавета нібыта адразу адвезлі ў Мінск, у следчы ізалятар КДБ, таму ў абласным цэнтры нікому ніякія падрабязнасці справы Карпуця не вядомыя. І нават бліжэйшыя падначаленыя неафіцыйна сцвярджаюць, што пра лёс свайго былога начальніка нічога не ведаюць.

Але афіцыйна сказаць хоць што-небудзь (ну, хаця б, што добры і працавіты быў чалавек) ім страшна. Напэўна, у генная памяці савецкіх людзей застаўся той страшны 1937 год і галоўнае правіла выжывання тых часоў: калі да некага завітаў "чорны воран", то лёсам гэтага чалавека цікавіцца нельга.

І не цікавяцца. Ні чыноўнікі, ні абласныя газеты. Маўчыць міліцыя, анямеў КДБ, набрала ў рот вады пракуратура. Членам Савета Рэспублікі, трэба разумець, таксама няма ніякай справы да лёсу калегі — са спісаў сенатараў яго яшчэ не выключылі, але ўсе робяць выгляд, што нічога неардынарнага не адбылося: ну, не прыязджае чалавек на пасяджэнні — і толькі. Па крайняй меры, "пытанне Карпуця" ні на сесіі Савета Рэспублікі, ні на прэзідыуме не разглядалася. Хаця калі сапраўды Карпуць у СІЗА, то гэта — надзвычайны прэцэдэнт. Бо яшчэ нядаўна менавіта Савет Рэспублікі павінен быў даваць дазвол на падобны арышт, бо на членаў Нацыянальнага сходу распаўсюджвалася "дэпутацкая недатыкальнасць". Але напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў заканадаўства было так "удасканалена", што зараз для арышту не патрэбен не тое што дазвол сенатараў, але і дазвол пракурора. Таму ніхто не можа адказаць на пытанне, сапраўды арыштаваны Аркадзь Карпуць альбо чалавек, вельмі падобны на яго…

Дарэчы, аб пракурорах. Пра дзікую гісторыю з арыштам старшага следчага Генеральнай пракуратуры Святланы Байковай мы ўжо пісалі. Але зараз пра лёс следчага, якая ўзнагароджана вышэйшымі дзяржаўнымі ўзнагародамі, вяла самыя гучныя справы апошніх часоў, вядома яшчэ меней, чым адразу пасля яе арышту.

Нагадаю, што па апошняй справе, якую рыхтавала для перадачы ў суд Святлана Байкова, праходзілі былыя высокапастаўленыя супрацоўнікі КДБ — і Брэсцкага абласнога УКДБ, і нават цэнтральнага апарату. Але раптам у кабінеце Байковай з'явіліся дужыя хлопцы з пастановай на арышт яе самой, якую падпісаў старшыня КДБ Вадзім Зайцаў. Нават генеральны пракурор Рыгор Васілевіч не здолеў вызваліць Байкову, хаця пайшоў на адкрытае супрацьстаянне са спецслужбай і звярнуўся ў суд, каб адмяніць пастанову на арышт Байковай. Суд Васілевічу адмовіў. Просты раённы суд Мінска развярнуў генеральнага пракурора разам з ягонай скаргай на дзеянні КДБ!.. У якой краіне такое можна ўвогуле ўявіць?..

У выніку ўсе чакалі, калі пройдуць два месяцы з дня арышту Байковай, бо нават па новым заканадаўстве пасля гэтага тэрміну чалавека нельга трымаць у турме без санкцыі пракурора. Два месяцы прайшлі, але цяпер ніхто ўвогуле не можа адказаць на пытанне, дзе зараз знаходзіцца Святлана Байкова.

Спачатку з'явілася інфармацыя, што Рыгор Васілевіч адмовіўся даць санкцыю на працяг тэрміну яе арышту і што з ягонага кабінета жанчына вярнулася дадому. Але ў той жа дзень, бліжэй да вечара, у СМІ прыйшоў электронны ліст за подпісам нібыта мужа Святланы Байковай, у якім сцвярджаецца, што, як толькі Васілевіч вызваліў сваю падначаленую, КДБ завёў на яе новую справу і арыштаваў па новай. Такім чынам, пайшоў новы двухмесячны адлік…

Што гэта — хворая фантазія ці наша рэальнасць? Няма адказу на гэтае пытанне. Што адбылося на самай справе, дабіцца проста немагчыма: пракуратура адсылае з усімі пытаннямі да КДБ, а упраўленне інфармацыі Камітэта дзяржбяспекі сцвярджае, што ім няма чаго расказаць журналістам. Наўмысна створана замкнёнае кола недагаворанасці і маўчання. Бо нельга, проста нерэальна патлумачыць, як магло здарыцца такое, што ў "прававой дзяржаве" магчыма, каб следчаму, які вядзе справу супраць супрацоўнікаў КДБ, не далі давесці яе да суда, бо кіраўнік гэтага самага Камітэта выпісаў пастанову на арышт такога следчага?.. Гэта сапраўды выклік і закону, і здароваму сэнсу, і асновам юрыдычнай навукі.

…Ціха па краіне ездзіць "чорны воран". Пакуль ён не завітаў да вас у хату, можна рабіць выгляд, што нічога не адбываецца, што Беларусь — свабодная краіна свабодных людзей. Але Беларусь несвабодная краіна. І людзі ў ёй, нават не простыя пешкі, а тыя, хто пры паўнамоцтвах і пасадах, — несвабодныя. Бо нават у генеральнага пракурора ўжо няма дастаткова ўлады, каб спыніць нахабства і ўседазволенасць новых апрычнікаў.

Святлана КАЛІНКІНА.

Амнистия все-таки будет

Александр Лукашенко наконец внес в Палату представителей проект закона "Об амнистии в связи с 65-летием Победы в Великой Отечественной войне 1941—1945 годов".

Как сообщает пресс-служба главы государства, "по предварительным расчетам МВД, в результате амнистии может быть освобождено из исправительных учреждений закрытого типа около 2230 человек, из исправительных учреждений открытого типа — около 900 человек, сокращен срок наказания 9300 осужденным".

Аляксандр МІЛІНКЕВІЧ:

«Мы можам выйграць нават на паўдэмакратычных выбарах»

Учора ў мінскім гатэлі "Еўропа" беларускім журналістам быў раскрыты сакрэт полішынеля — экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Мілінкевіч абвясціў аб пачатку сваёй перадвыбарнай кампаніі. Такім чынам, лідэр руху "За Свабоду" робіць другую спробу трапіць ва ўладу.

"Я іду на выбары, каб перамагаць", — раз-пораз паўтараў Аляксандр Уладзіміравіч.

Нагадаем, што і ў прэзідэнцкай кампаніі 2006 года Мілінкевіч казаў тое самае. Але пасля таго, як былі абвешчаны вынікі выбараў, высветлілася, што Мілінкевіч і ягоныя выбаршчыкі пад словам "перамагаць" мелі на ўвазе рознае. Як прызнаўся Мілінкевіч, галоўным для яго была "перамога ў галовах людзей" і "рост пратэстных настрояў у грамадстве"...

Таму цікава было даведацца, як Аляксандр Мілінкевіч збіраецца перамагаць на гэты раз. Мы чакалі канкрэтнага адказу на канкрэтныя пытанні. Вось што атрымалася.

— Вы ўжо сёння заклікаеце людзей выйсці на вуліцу пасля падліку галасоў на прэзідэнцкіх выбарах. Дзеля чаго? Каб узяць уладу сілавым шляхам ці дзеля таго, каб паказаць, што нас шмат?

— Самае галоўнае, што мы мусім рабіць падчас кампаніі, — гэта перамагаць у галовах людзей. Не перамагаць канкрэтна аднаго начальніка, другога, трэцяга, не біць па галаве міліцыю... Мы павінны перамагчы ў галовах людзей. Яны павінны разумець, што трэба жыць па-іншаму, яны павінны пазбаўляцца страху... І добрая прэзідэнцкая кампанія, я такія рабіў. Я разам са сваімі сябрамі-калегамі зрабіў лепшую кампанію ў 2001 годзе Сямёну Домашу. Лічу, што тая кампанія была і сапраўды добрай, але Домаш зняўся, і кампанія паблякла. Я лічу, што я зрабіў добрую кампанію ў 2006 годзе, дзе я быў адзіным кандыдатам.

Чаму мы ідзем, а не байкатуем выбары? Кампанія для нас — павелічэнне пратэстнага настрою, павелічэнне мабілізацыі людзей і спосаб пераконваць людзей, што ніхто за нас гэтага не зробіць. Таму мы выходзім на вуліцу, калі ўлада не хоча лічыць разам з намі галасы, мы выходзім на вуліцу, каб прымусіць Цэнтральную выбарчую камісію яшчэ раз правесці, але ўжо сумленныя выбары. Іншага не будзе. Калі мы не будзем пратэставаць, калі мы як грамадзяне не скажам на вуліцы пасля такога здзеку за сябе слова, то мы будзем увесь час жыць у дыктатуры. Таму я веру, што мы здолеем дагрукацца да людзей, веру ў патэнцыял Беларусі, веру, што мы будзем жыць у іншай краіне ў рэшце рэшт. Я веру, што людзі прачнуцца, я веру, што яны адстаяць сваё права жыць годна.

— У нядаўнім інтэрв'ю аднаму з расійскіх інтэрнет-рэсурсаў вы сказалі, што без доступу да дзяржаўнага тэлебачання ў апазіцыйнага кандыдата амаль няма шанцаў быць вядомым у краіне, мала шанцаў на перамогу. Адсюль пытанне: на якія канкрэтныя крокі вы гатовы пайсці, каб атрымаць тэлеэфір?

— Ведаце, на тыя ж крокі, што мы кажам і пра падлік галасоў. Сумленныя выбары — гэта не толькі падлік галасоў, гэта, дарэчы, і тое, пра што вы кажаце. Гэта доступ да электронных медыя, якія фактычна манапалізаваны на Беларусі. Патрабаванне мусіць быць. Трэба, каб патрабаванне было здзейснена. Але я вам хачу сказаць, што мы рабілі кампаніі за столькі гадоў, за гэты час і без тэлебачання. Людзі нас падтрымлівалі. Трэба было працаваць. Трэба было ездзіць па краіне, сустракацца з імі і ціснуць ім руку. Гаварыць ім тыя словы, пасля якіх яны вераць, што мы ідзем на перамогу і мы клічам адстаяць сваё права на перамогу. Няма тэлебачання — трэба сустракацца, дзейнічаць праз інтэрнэт, бюлетэні, праз вашу газету, якая мусіць стымуляваць людзей, не павялічваць настроі песімізму, а надаваць людзям духу. І так кожная газета. Я лічу, што нават у тых умовах, што ёсць, мы можам зрабіць кампанію, у якой большасць людзей будзе нас падтрымліваць. Сумленныя выбары гэтая ўлада больш ніколі не выйграе. А мы можам выйграць нават на паўдэмакратычных выбарах...

Калі б вы ведалі, як мне хацелася не быць песімістам, калі я атрымаў рэдакцыйнае заданне напісаць пра новы старт Мілінкевіча! Але засталося ўражанне, што нешта падобнае я ўжо чуў ад Мілінкевіча ў 2006 годзе. А вось слова "прабачце" за тое, што тая кампанія не стала пераможнай, ад кандыдата я так і не пачуў... Як не пачуў і нічога канкрэтнага пра тое, як спадар Мілінкевіч будзе перамагаць на гэты раз. Няўжо ён не разумее, што людзі чакаюць ад яго не агульных фраз, не трафарэтных заяў, а рашучых дзеянняў?

Віталь ГАРБУЗАЎ.

БАТЭ заняў месца ЦСКА

Чарговы клубны рэйтынг апублікавала Міжнародная федэрацыя футбольнай гісторыі і статыстыкі. Найлепшым клубам свету па-ранейшаму застаецца іспанская "Барселона", у якой 322 балы. Барысаўскі БАТЭ ўзняўся з 77-га на 66-е месца, якое месяц таму займаў маскоўскі ЦСКА, і мае 146 ачкоў.

Мінскае "Дынама" займае ў рэйтынгу толькі 336-е месца.

ОТКРЫТЫМ ТЕКСТОМ

Павел ЗНАВЕЦ,
депутат Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва

Главное условие,

без выполнения которого нельзя идти на президентские выборы

Я все чаще и чаще замечаю: чем ближе политическая кампания под названием "Выборы президента Беларуси", тем меньше говорят о главном условии, от которого, на мой взгляд, зависит дальнейшее развитие событий в нашей стране, судьба нации и государства. Мышиная возня идет вокруг второстепенных вопросов, и в то же время фактически замалчивается то, что должно быть важнейшим приоритетом для всех, кому дорога Беларусь, ее завтрашний день, наше будущее, а также будущее наших детей и внуков.

Речь идет, конечно, о Лукашенко, а точнее о том, пойдет ли он на очередной президентский срок или все же власть окажется в руках другого человека, не обремененного прошлым со многими ошибками, нарушениями законов и Конституции. Понятно, если бы не последнее обстоятельство, возлагающее на Александра Григорьевича личную ответственность, я уверен, ему легче было бы принять правильное решение. Но история, к сожалению, не знает сослагательного наклонения. И все же нельзя думать только о себе, когда за плечами почти 10 миллионов человек.

Не нужно быть профессором-правоведом, чтобы отчетливо понимать: осенью 1996 года в Республике Беларусь под прикрытием референдума произошел государственный антиконституционный переворот. Он сопровождался изданием указа президента, предписывающего не исполнять решения Конституционного суда, силовым блокированием Центризбиркома, в буквальном смысле слова выносом тела его председателя Виктора Гончара из офиса и т.д. Со стороны главы государства пошел массовый отсчет грубейших нарушений права. На сессии Верховного Совета тогдашний председатель Конституционного суда В.Тихиня назвал действия президента и его окружения **ПРАВОВЫМ ЧЕРНОБЫЛЕМ.** Это, на мой взгляд, самая точная характеристика того, что происходило в 1996 году в Беларуси. Констатирую это безотносительно к характеру действий самого В.Тихини тогда и в последующее время.

Чтобы ответить на вопрос, имеет ли право А.Лукашенко баллотироваться на очередной президентский срок, нельзя обойти стороной и такую болезненную проблему. До сих пор остаются кровоточащими события, произошедшие в Беларуси в 1999—2000 годах. Свершившимся злодеяниям не может быть оправдания, для них нет срока давности. Произошли не просто похищения, а, на мой взгляд, есть основания утверждать что состоялись внесудебные казни политических лидеров оппозиции Виктора Гончара, Юрия Захаренко, а также бизнесмена Анатолия Красовского и журналиста Дмитрия Завадского. Такого рода преступления, если будет в судебном порядке доказано, что к ним причастна действующая власть, являются преступлениями против человечности. Это тягчайшие преступления, и они подпадают под юрисдикцию Международного уголовного суда. Без получения ответа на вопрос, кто повинен в них, без наказания исполнителей и заказчиков этой чудовищной уголовщины **полноценное участие в президентских политических кампаниях будет являться профанацией и очередным политическим бизнесом.**

Я лично ставлю вопрос так: в срочном порядке должна быть создана совместная белорусско-европейская следственная комиссия (с участием российских специалистов) по расследованию фактов похищений и, возможно, внесудебных казней в 1999—2000 годах **Юрия Захаренко** — бывшего министра внутренних дел, **Виктора Гончара** — бывшего заместителя премьер-министра и председателя Центризбиркома, **Анатолия Красовского** — генерального директора фирмы "Красико", **Дмитрия Завадского** — журналиста, оператора Общественного российского телевидения (ОРТ).

Мои обращения имеют целью не только информирование субъектов белорусской политики, но и доведение до них тех аргументов, игнорировать которые просто невозможно.

Александр Григорьевич! Обращаюсь к Вам уважительно, несмотря ни на что, ибо, полагаю, в Ваших интересах всячески содействовать созданию такой комиссии, независимо от того, что произошло с вышеуказанными людьми в 1999—2000 годах. **Исчезли не рядовые граждане, не бомжи, а среди них есть те, кто с Вами работал и помог Вам взойти на вершину власти.** Ваш долг и прямая обязанность — всеми доступными средствами установить судьбу этих людей. Ведь, будем откровенны, сегодня не только в среде оппозиции, но и на международном уровне Вас обвиняют уже не только в сокрытии этих вопиющих преступлений, но и говорят о Вашей причастности к тому, что произошло. С каждым годом историческая и политическая цена этого вопроса растет, и если не дать на него сегодня четкого ответа, то со временем тяжесть ответственности умножится. Все это может сказаться не только на Вашей судьбе, но и на судьбе Ваших близких. Они, как Вы понимаете, не должны слыть родственниками того, кого общественность и международные политические структуры подозревают в совершении тягчайших преступлений — преступлений против человечности. Ваш долг и обязанность — отмести всякие подозрения, призвав на помощь международных экспертов и следователей, коль собственные за 10 лет из-за трусости, некомпетентности либо по иным причинам не смогли раскрыть эти преступления. Если международная следственная комиссия и суд установят вину тех лиц, которых Вы назначали на важнейшие государственные посты, а Ваша причастность к организации и совершению этих тягчайших преступлений не будет доказана, у Вас будет возможность, как говорится, сохранить свое лицо. Время с каждым днем работает не только против тех, кто совершил эти злодеяния, но и против Вас. Поскорее прояснить ситуацию — это Ваш прямой долг и перед родственниками исчезнувших, поскольку Вы с ними практически не встречались. Ведь и они уже не только говорят о том, что Вы укрываете преступников, но и прямо или косвенно обвиняют Вас в причастности к их деяниям.

Исходя из тех материалов, что стали доступны общественности, Международной следственной комиссией должны быть допрошены под присягой в первоочередном порядке:

а) бывший генеральный прокурор **О.Божелко**,

б) бывший секретарь Совета безопасности, а позже назначенный на должность Генпрокурора **В.Шейман**,

в) бывший председатель КГБ **В.Мацкевич,**

г) бывший начальник СИЗО №1 **О.Алкаев,**

д) бывшие министры МВД **В.Наумов** и **Ю.Сиваков**,

е) бывший начальник Главного управления криминальной милиции МВД, автор рапорта, на котором стоит виза В.Наумова, генерал **Н.Лопатик**,

ж) бывший командир СОБРа **Д.Павличенко**,

з) один из бывших начальников вашей службы безопасности **Н.Васильченко**,

и) попросившие политическое убежище за границей бывшие работники прокуратуры и КГБ Беларуси **Д.Петрушкевич, О.Случек и Г.Угляница**,

к) бывший начальник Контрольно-ревизионного управления Министерства культуры **А.Грачев** и другие.

(Окончание на 2-й стр.)

Слова на развітанне

Людзей умоўна можна падзяліць на дзве катэгорыі: звычайных і неардынарных. Лёня Аноп у поўнай меры ўсім сваім жыццём паказаў, што належыць да апошніх. Пазнаёміліся мы яшчэ ў школьныя гады, бо нашы вёскі знаходзіліся недалёка адна ад адной, на тэрыторыі Сакаўшчынскага сельсавета, што на Валожыншчыне. І моцна пасябравалі, хаця наведвалі розныя школы. Аб'ядноўвала нас прага пісаць вершы і мара стаць журналістамі. Лёня рос вельмі ўдумлівым, цікаўным да жыцця маладым чалавекам. І сябрам ён быў сапраўдным. Памятаю, калі на першым курсе мне не ўдалося атрымаць інтэрнат, дык Лёня запрасіў мяне жыць "зайцам" у цесным пакойчыку інтэрната на мілай большасці журфакаўцаў Паркавай магістралі, дзе ўжо мясціліся шэсць студэнтаў.

Там, у інтэрнаце, Лёня знайшоў прыгажуню Галю з філфака, з якой пазней падзяліў свой жыццёвы лёс і выхаваў цудоўных дачку і сына. Пасля універсітэта нашы жыццёвыя шляхі разышліся ў розныя бакі. Самастойнае жыццё рамантык Аноп пачынаў не ў зусім рамантычным асяроддзі — яго прызвалі на воінскую службу, і будучы журналіст два гады насіў афіцэрскія пагоны.

Пасля дэмабілізацыі ён, канечне ж, мог знайсці сабе цёплае месца дзе-небудзь у Мінску, аб чым марыў практычна кожны выпускнік факультэта журналістыкі. А ён узяў і махнуў, як кажуць, на самы край свету, у горад Анадыр, дзе ўладкаваўся на працу ў газету "Советская Чукотка". Не магу сказаць, колькі дакладна, але, напэўна, гадоў з сем правёў Леанід Аноп у гэтым суровым краі і вырас да намесніка старшыні Чукоцкага акруговага камітэта па радыёвяшчанні і тэлебачанні. Вярнуўшыся ў Беларусь, аўтарытэтны журналіст, што прайшоў такую добрую школу, не кінуўся шукаць нейкую выгадную пасаду, а паехаў працаваць карэспандэнтам гарадскога радыёвяшчання ў Жлобін. І прафесіянала неўзабаве заўважылі ў Мінску, запрасілі працаваць на рэспубліканскае радыё. Тут, можна сказаць, творчая жылка таленавітага журналіста праявілася ў поўнай меры. Напэўна, большасць беларускіх радыёслухачоў памятае бойкую, насычаную аператыўнымі навінамі праграму "Радыёфакт". Ля вытокаў яе стаяў Леанід Аноп. Безумоўна, ён мог зрабіць імклівую кар'еру, калі б пайшоў на кампраміс з уласным сумленнем. Але паступіў інакш і аднойчы, на здзіўленне калег з традыцыйнымі поглядамі на жыццё, сышоў з Беларускага радыё. А праз некаторы час на старонках "Народнай Волі" з'явіліся яго рэпартажы з далёкай Амерыкі. Пісаў ён цікава, глыбока, даносячы чытачам праўду аб зусім іншым свеце, прымушаючы задумвацца, чаму ж нам не ўдаецца больш цывілізавана, дэмакратычна арганізаваць сваё жыццё.

Ведаю, што ў Лёні былі ўсе магчымасці назаўсёды застацца ў ЗША. Але Аноп ёсць Аноп, да навакольнага свету ён ніколі не адносіўся лёгкадумна і павярхоўна, разумеючы, што жыццё на чужбіне — гэта не найлепшы варыянт. Ён вярнуўся ў Беларусь.

Ды толькі жыць на радзіме яму заставалася нядоўга... Яшчэ літаральна тры тыдні таму мы разам з бліжэйшымі сябрамі Лёні наведалі яго ў шпіталі пасля аперацыі. Ён быў у нядрэнным настроі, увесь час стракатаў на розныя тэмы, узгадваў пра сваю родную Сакаўшчыну, і выглядала на тое, што не ведае аб страшным захворванні. І вось — згарэў, нібы свечка. Якая ўсё ж пакінула прамень святла Лёневага сэрца на гэтай Зямлі. Бывай, дарагі сябра!

Міхаіл БАЦЯН.

Развітанне з нябожчыкам адбудзецца сёння, 4 мая, да 14.00 па адрасе: Мінск, вул.Л.Украінкі, 12, корп. 1, кв.536.

Народная Воля
http://www.nv-online.by
4—6 МАЯ 2010 г.

ОТКРЫТЫМ ТЕКСТОМ

Главное условие,

без выполнения которого нельзя идти на президентские выборы

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Это далеко не полный перечень тех фигурантов дела, подлежащих допросу **в первоочередном порядке.** По поводу последней из перечисленных фамилий требуется пояснение, так как она не фигурирует в известном меморандуме спецдокладчика Парламентской ассамблеи Совета Европы Христоса Пургуридеса. А.Грачев был похищен группой неизвестных лиц и вывезен в лес за пределы Минска, предположительно в район Северного кладбища. Там ему угрожали приставленным к голове пистолетом и избили. Впоследствии Грачев опознал Д.Павличенко, который присутствовал при его похищении. Данный эпизод был полностью доказан следственным путем, что также подтверждает вышеупомянутый следователь Прокуратуры Республики Беларусь Д.Петрушкевич, участвовавший в расследовании уголовного дела по факту похищения А.Грачева. Однако дело было прекращено, когда генеральным прокурором был назначен В.Шейман. Многие из тех, кто исследует тему громких похищений и последовавших с большой долей вероятности внесудебных казней, именно “делом Грачева” объясняют ваше решение отправить в отставку министра культуры А.Сосновского.

Александр Григорьевич! В одном из интервью журналистам Вы саркастически усомнились в том, что Виктор Гончар был оппозиционером. Но у меня, как и у других депутатов Верховного Совета, имеется документ под названием “ЗАКЛЮЧЕНИЕ СПЕЦИАЛЬНОЙ КОМИССИИ ПО ПРАВОВОЙ ОЦЕНКЕ НАРУШЕНИЙ ПРЕЗИДЕНТОМ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ А.ЛУКАШЕНКО КОНСТИТУЦИИ И ЗАКОНОВ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ”. В нем содержится анализ многих Ваших указов и распоряжений, нарушающих действовавшую в то время Конституцию и законы. Скажите, как назвать человека, решившегося на борьбу с Вами, точнее — на восстановление в стране законности, демократии, соблюдения гражданских прав? Конечно, Виктор Гончар встал по отношению к Вам в оппозицию. И не нужны здесь никакие спекуляции и домыслы. Не буду утверждать, снится ли Вам иногда Виктор Иосифович, но скажу определенно: в одном из своих последних интервью (“Белорусской газете”) он говорил о своем твердом намерении в 2001 году баллотироваться в президенты страны. Не это ли предрешило его судьбу?

В правоохранительных органах многие работники хорошо информированы о том, что же произошло в 1999—2000 годах. Страх и паралич воли, охвативший бывших руководителей этих структур, отнюдь не означают, что они смирились со своей незавидной участью. Все тайное станет явным, но тогда уже поздно будет искать любые оправдания нынешнему блокированию международного расследования этих тягчайших преступлений.

Понятно: какой ответ последует от А.Лукашенко на мое обращение к нему, зависит только от него. Но это не значит, что все остальные высокопоставленные должностные лица должны занять позицию “моя хата с краю, ничего не знаю”. Помочь Александру Григорьевичу принять принципиальнейшее решение призваны и лидеры оппозиции. Поэтому я обращаюсь к тому же Александру Милинкевичу. Будет непростительной ошибкой, если Вы, Александр Владимирович, пойдете на выборы, не выдвинув перед властями главнейшее условие — провести независимое международное расследование уголовных дел, связанных с похищением известных политиков В.Гончара и Ю.Захаренко, бизнесмена А.Красовского и журналиста Д.Завадского. Давно пора поставить точку в муссировании властью слухов о “германских и прочих следах” исчезнувших, о неких криминальных разборках. Миссия представителя ПАСЕ Х.Пургуридеса и его известный меморандум о политических исчезновениях людей в Беларуси, опубликованные копии многих документов уголовного дела, а также факты, изложенные в документальной книге бывшего начальника СИЗО №1 О.Алкаева “Расстрельная команда”, не оставляют практически никаких сомнений в причастности к совершению тягчайших преступлений лиц из ближайшего окружения президента. Вопросы, заданные прямо в лицо президенту Лукашенко по поводу фактов, изложенных в этой книге, экс-кандидатом в президенты **Александром Козулиным,** остались без ответа. Уголовные дела ни в отношении Алкаева, ни в отношении лиц, на которых указывает Алкаев, не возбуждались, никто практически не был допрошен. В общем, из-за страха и трусости следствие не ведется, а Александр Григорьевич Лукашенко в одном из интервью даже употребил крайне оскорбительный термин “заезженная пластинка” в отношении тех журналистов, кто еще пытается задавать вопросы о чудовищных по своей сути злодеяниях. В сложившихся условиях Вы, Александр Владимирович, как политик и человек просто обязаны обратиться к Александру Лукашенко и к руководству Евросоюза и России с предложением срочно приступить к созданию международной комиссии по расследованию похищений лидеров оппозиции, бизнесмена и журналиста российского телеканала ОРТ. **До завершения работы следственной комиссии президентские выборы должны быть отложены, так как должна быть установлена причастность либо непричастность высших должностных лиц к совершению тягчайших преступлений.** От результатов расследования будет зависеть и политическая судьба Александра Лукашенко безотносительно к тому, что было совершено им и его окружением в 1996 году во время проведения референдума по внедрению новой конституции.

Милинкевич и все остальные претенденты на главный пост страны должны четко заявить общественности, **что любое их участие в президентских выборах до завершения международного расследования фактов политических похищений известных людей в принципе невозможно**. Совершать политическое восхождение по трупам одних из самых ярких фигур белорусской политики конца XX века, зарабатывать на этом дивиденды не просто аморально, это — кощунственно. Прежде всего по отношению к родным и близким похищенных, можно предполагать, убитых.

Вокруг создания и деятельности международной следственной комиссии по политическим похищениям и внесудебным казням должна строиться вся стратегия оппозиции и международных структур. И только после завершения ее работы, уже в новой, свободной от страха атмосфере, можно будет обсуждать условия проведения предстоящей президентской кампании.

Я уже сказал, что история не имеет сослагательного наклонения. Но она позволяет ценой как массовых жертв (большевистско-сталинские репрессии), так и жертв отдельных ярких личностей (Карпенко, Захаренко, Гончар и др.) извлекать уроки и цивилизованно строить жизнедеятельность общества и свою собственную жизнь. Но нельзя строить свою жизнь, свою карьеру на незахороненных костях ярких личностей. Как политик и как гражданин, участвовавший в избирательных кампаниях экс-кандидатов в президенты С.Домаша, В.Гончарика и А.Козулина, я принял для себя решение не участвовать в избирательных фарсах до полного выяснения всего, что произошло с Захаренко, Гончаром, Красовским и Завадским, до человеческого захоронения останков их тел и наказания виновных в организации и совершении жутких преступлений.

ПАЛІТКУХНЯ

«Малады фронт» ідзе на рэкорд

Міжнароднае маладзёжнае аб'яднанне "Малады фронт" (Чэхія) для рэгістрацыі ў Беларусі мае намер правесці чарговы ўстаноўчы з'езд 29 мая. Пра гэта БелаПАН паведаміў лідэр арганізацыі Дзмітрый Дашкевіч.

Паводле яго слоў, 1 мая прайшоў сойм арганізацыі. "На ім была дадзена ацэнка мінулым выбарам у мясцовыя Саветы. Безумоўна, мы адзначаем, што вынікі гэтай кампаніі не адпавядаюць рэальнаму волевыяўленню беларускага народа. Таму мы заклікаем беларускую і міжнародную грамадскасць не прызнаваць легітымнасць самапрызначаных дэпутатаў мясцовых Саветаў", — сказаў Дашкевіч.

Сойм вызначыў дату новага ўстаноўчага з'езда — 29 мая. "Мы маем намер запрасіць на з'езд не толькі журналістаў, але і міжнародных гасцей, прадстаўнікоў дыпламатычных місій. Акрамя таго, на з'езд будуць запрошаны і прадстаўнікі Міністэрства юстыцыі", — сказаў Дашкевіч.

Ён нагадаў, што з 2000 года гэта будзе ўжо сёмая спроба рэгістрацыі арганізацыі ў Беларусі. "Падчас апошняй спробы рэгістрацыі Мінюст адмовіў у легалізацыі арганізацыі на той падставе, што многія члены "Маладога фронту" прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці. З гэтага Мінюст зрабіў выснову, што заснавальнікі "Маладога фронту" не маюць намеру ажыццяўляць дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Беларусі. Атрымліваецца абсурднае замкнёнае кола: улады лічаць супрацьзаконнай будучую дзейнасць арганізацыі, якая яшчэ не зарэгістравана, і на гэтай падставе не рэгіструюць арганізацыю, тым самым правакуючы дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, што супярэчыць заканадаўству", — адзначыў Дашкевіч.

Паводле яго слоў, калі прадстаўнікі Мінюста прыйдуць на з'езд, актывісты арганізацыі маюць намер высветліць, што азначае такая "прэзумпцыя вінаватасці" і як можна зарэгістраваць арганізацыю ў гэтай сітуацыі.

Сяргей ПУЛЬША, БелаПАН.

ПО СЕКРЕТУ ВСЕМУ СВЕТУ...

Какие тайны ищет Служба собственной безопасности МВД

Иногда сенсации рождаются почти из мусорки. Оказывается, бумажка с цифрами, которую ты до конца даже не прочитала и собиралась выбросить за ненадобностью, может представлять огромный интерес для правоохранительных органов.

«Следователь разберется...»

16 марта у меня в квартире был обыск. По официальной версии, искали информацию, компрометирующую экс-начальника УКГБ Гродненской области генерала Коржа. Оперуполномоченный Московского РУВД Листопадов, просматривая содержимое моего стола, достал оттуда какие-то бумажки. Если не ошибаюсь, он их просто одними из первых вытащил из ящика — там было много и всякого другого добра. Просмотрев написанное по диагонали (а там была прошлогодняя сухая милицейская статистика), Листопадов попросил оператора, который фиксировал процедуру обыска на видео, заснять каждую страничку. Я удивилась: если бумаги не имеют совершенно никакого отношения к уголовному делу про Коржа, зачем их фиксировать? Листопадов ответил что-то типа: мол, следователь разберется.

А в минувшую среду, 28 мая, меня пригласил на официальную беседу один из сотрудников Службы собственной безопасности МВД. Весь вечер я ломала голову, что от меня может хотеть служба, *“основным содержанием деятельности которой является предупреждение, выявление и пресечение правонарушений, совершаемых сотрудниками органов внутренних дел и военнослужащими внутренних войск, в том числе очищение коллективов от всякого рода предателей интересов службы, взяточников, нарушителей законности и прочих элементов, подрывающих авторитет милиции в глазах общества и наносящих непоправимый ущерб государству”.* Юрист Белорусской ассоциации журналистов **Андрей Бастунец**, с которым я обсудила данную ситуацию, спросил: “Может, ты на какого-нибудь милиционера жалобу написала, а они теперь проверку устроили?”

Как оказалось, дело совсем не в жалобах.

«Для служебного пользования»

Придя в МВД, я услышала примерно следующее: им передали диск с изображением бумаг, сфотографированных у меня дома. Если я все правильно поняла со слов своего собеседника, то какая-то там экспертная комиссия решила, что эта статистика проходит под грифом “Для служебного пользования”. И теперь Служба собственной безопасности разбирается, как ко мне могла попасть подобная информация. Вернее, кто из Главного управления кадров МВД мог “слить” секретные цифры.

Я вежливо отказалась отвечать на вопросы представителей Службы собственной безопасности. Хотя они и уверяли, что никто не запрещает сотрудникам органов внутренних дел общаться с представителями прессы. И главное, чтобы у них был для этого позитивный мотив, направленный на благо родины. Со слов начальника Службы собственной безопасности, вполне вероятно, что человека, который передал мне эти бумаги, может быть, даже и поощрят.

Я пожелала им успехов.

Бумажная бомба

Выйдя из МВД, я даже улыбнулась. “Секретные бумаги” провалялись у меня неизвестно сколько времени, а я даже и не подозревала, что они такие ценные! И если бы не эта “душещипательная беседа”, то при ближайшем наведении порядка в столе я стопроцентно отправила бы их в мусорку. За ненадобностью.

Бумаги мне передали после одной из коллегий МВД — в качестве иллюстративного материала. Никаких опознавательных знаков, грифов с печатями и подписями на этих страницах, естественно, не было. Просто напечатанный текст. Если не ошибаюсь, дело было перед выходными, поэтому я взяла текст домой. Прочитала первые полстранички и бросила — скукотища. Похоже на пресс-релиз, который обычно раздают сотрудники пресс-службы МВД перед отчетными пресс-конференциями своего министра.

Вернувшись домой, я отыскала бумаги, которые едва не выкинула. И уже до конца ознакомилась с тем, что, как выяснилось, хотят скрыть от налогоплательщиков представители МВД.

Вот лишь некоторые — самые яркие, на мой взгляд, цифры.

Уровень некомплекта кадров в органах и подразделениях внутренних дел на 1 декабря 2009 года

Общий некомплект аттестованного состава на протяжении последних 5 лет колебался в пределах 6—8%, за исключением отдельных категорий служб.

Высокая текучесть кадров и хронический некомплект стали неотъемлемым фактором, характеризующим деятельность участковых инспекторов милиции. По состоянию на 1 декабря 2009 года, некомплект составил 8,0%. Наиболее сложная ситуация в службе участковых инспекторов милиции ГУВД Минского горисполкома, где некомплект на 1 декабря 2009 года составил 15,5%. Такая же тенденция характерна и для Гомельского и Минского облисполкомов, где на время подготовки отчета некомплект участковых инспекторов милиции составлял 9,6% и 9,0% соответственно.

Вызывает обеспокоенность рост количества сотрудников, уволенных по отрицательным мотивам. В 2008 году было уволено 1524 сотрудника, что на 552 больше, чем в 2007 году, и на 924 больше, чем в 2006 году.

За прошедший период 2009 года было уволено 842 сотрудника, что на 66 меньше, чем за аналогичный период 2008 года, однако процент от общего количества уволенных по-прежнему высок — 48,1%.

Многие сотрудники, назначенные на руководящие должности в МВД, были освобождены от должности, проработав менее года.

По состоянию на 1 января 2009 года были вакантными 29 должностей по основной номенклатуре МВД.

О том, сколько сотрудников органов внутренних дел уволено, в том числе и за какие-то проступки, каждый год говорил экс-министр внутренних дел **Владимир Наумов**. Отвечая на вопросы по этой тематике, он подкреплял свои слова конкретными цифрами.

И про то, что у нас не хватает участковых, как мне кажется, уже тоже писано-переписано. На сайте ГУВД Мингорисполкома и сегодня висит объявление: *“ГУВД Мингорисполкома приглашает на конкурсной основе всех желающих поступить на службу в органы внутренних дел на должности “участковый инспектор милиции”.* И порядок приема граждан на службу в органы внутренних дел, и сроки обучения расписаны от начала до конца: кого, с каким образованием, какими болезнями и т.д.

Более того: 29 июня минувшего года А.Лукашенко проводил совещание с оперативно-начальствующим составом органов внутренних дел.

“Для МВД характерна непродуманность и непоследовательность при решении кадровых вопросов, что приводит к снижению профессионального уровня сотрудников, — цитирует главу государства президентский портал. — *За последние 2 года вырос общий некомплект личного состава, который на 1 июня 2009 года составил 9%, в службе по борьбе с коррупцией и экономическими преступлениями — практически 11%, в подразделениях патрульно-постовой службы — 19%. Высокая текучесть кадров также негативно сказывается на деятельности участковых. Некомплект последних на 1 июня в целом по республике составил 9%, при этом в Минской области — 11%, а в Минске — 20%. По данным опроса, каждый четвертый милиционер назвал такое положение дел следствием неприемлемого стиля руководства со стороны непосредственных начальников, создающих нервозную обстановку в коллективе”.*

Вот вам и секретные секреты под грифом “ДСП”...

Марина КОКТЫШ.

СВЕТСКАЯ ХРОНИКА

Мисс Беларусь-2010: и будешь ты царицей мира?

В Минске под эгидой телеканала ОНТ прошел финал конкурса “Мисс Беларусь-2010”. Красавицы дефилировали в купальниках, красовались в вечерних платьях от Юдашкина и... переодевались в спортивных раздевалках.

За кулисами

Когда женщине предлагают написать о конкурсе красоты, всегда есть опасность получить материал с подколками и шпильками. Еще бы, ведь каждая дама — прекрасна, и какими бы далекими ни были длинноногие прелестницы на сцене, но они всего лишь соперницы. Возможно, именно таким — острым и язвительным — вышел бы этот материал, если бы не Служба безопасности президента.

Ради спокойствия Лукашенко журналистам пришлось прийти во Дворец спорта, где проходил финал конкурса, за несколько часов до начала шоу. Во время первой проверки жаждущие попасть на “Мисс Беларусь” проходили через металлоискатель и предъявляли паспорта. Вторая проверка была более детальной: нужно было разбирать технику, показывать содержимое сумок и даже открывать пачки с сигаретами.

Те, кто проверку прошел, получали зеленые бирочки. Признаюсь, получая свою, я словно почувствовала себя больной, которой на руки выдали справку о том, что она-таки может находиться среди здоровых людей.

Перед началом шоу на путь истинный журналистов наставлял руководитель пресс-службы президента **Павел Легкий**. У него было одно замечание — фотографировать главу государства может только президентский пул. Всем остальным рисковать техникой и здоровьем не рекомендовалось.

Выдвигаясь к месту дислокации, а это два неогороженных помоста напротив сцены, журналисты могли наблюдать закулисье конкурса “Мисс Беларусь-2010”. Стройные красавицы, которые наводят лоск в спортивных раздевалках, измотанные визажисты и парикмахеры, рабочие сцены... Одним словом, шоу “Мисс Беларусь” организовывалась очень по-белорусски. Какое уж тут соперничество...

Первые лица

Шоу “Мисс Беларусь-2010” началось, как только самые именитые гости заняли свои места в зрительном зале. Лукашенко уже по традиции вышел в люди с сыном Колей. Мальчик всем живо интересовался, показывал пальчиком на сцену и хлопал под песню Дяди Вани “Моя Белараша”. Когда мальчик покинул зал, заметить не удалось, но уже через полчаса после начала концерта его место рядом с Лукашенко заняла девушка модельной внешности. Замглавы Администрации президента **Наталья Петкевич**, например, ютилась на самом краю VIP-ложи в компании **Инны Афанасьевой**. На мероприятие пожаловало и много других соратников президента.

Одной из самых ярких частей конкурса ожидаемо стало дефиле в купальниках. Организаторы решили наделить участниц конкурса неземными качествами и приделали к их спинам крылья. Так что по сцене порхали бабочки и ангелы.

31 участница конкурса выходила на сцену в национальных костюмах, купальниках и вечерних платьях. С вечерними туалетами связана отдельная история. Одел красавиц российский модельер **Валентин Юдашкин.** За наряды платили исполкомы или отделы культуры тех городов, которые представляют прелестницы. Электронная газета “Салідарнасць” подсчитала примерную стоимость всего юдашкинского “гардероба” для “Мисс Беларусь-2010”. Вышло около 15,5 миллиона на всех, или по 500 тысяч за выход. В данном случае красота потребовала финансовых жертв...

Полцарства в придачу...

Каким бы долгим ни было шоу “Мисс Беларусь-2010”, но и ему пришел конец. Среди завитых, напомаженных и вышколенных красавиц надо было выбрать одну. Самой-самой была признана **Людмила Якимович** из Гродно. Темноволосая дива приняла корону от предыдущей мисс Беларусь **Ольги Хижинковой.** Ближайшие два года Людмила Якимович будет носить звание не только самой красивой девушки Беларуси, но и лучшей фотомодели. Гродненская красавица еще в одном из полуфиналов завоевала титул “Мисс Фото”.

Теперь Людмила будет представлять нашу страну на конкурсе “Мисс Мира”, а в награду получит 50 миллионов белорусских рублей. К слову, главная “мисс” страны предыдущего конкурса получила в подарок квартиру.

На следующее утро представители телеканала ОНТ организовали пресс-конференцию. На ней красавицы еще раз рассказали о себе, поделились планами, ну а победительница вообще призналась, что попала на конкурс почти по ошибке.

“Собираясь на кастинг, моя хорошая подруга предложила сходить с ней за компанию, — призналась Людмила. — *Но подруга блондинка, пусть даже и очень симпатичная, а блондинок, как мне показалось, судьи в этом году не жаловали: в основном предпочтение отдавалось темноволосым девушкам”.*

Верить этой золушкиной истории или нет, каждый решает сам. В любом случае по сравнению с другими “грандиозными” проектами от отечественных телеканалов конкурс “Мисс Беларусь” имеет хотя бы одно неоспоримое преимущество — на нем собирается много красивых дам, которые делают все, чтобы понравиться публике.

Мария МАЛЕВИЧ.

Десять фактов о Людмиле Якимович

Спустя несколько дней после своей победы на конкурсе “Мисс Беларусь 2010” уроженка Гродно **Людмила Якимович** ответила на вопросы читателей на сайте электронной газеты “Белорусские новости”.

1.Учится на 5-м курсе Белорусского института правоведения по специальности “юридическая психология”.

2.Людмила не придерживается никаких диет. Она очень любит сладкое, а форму сохраняет благодаря посещению спортзала и бассейна.

3.Красавица предпочитает классический стиль в одежде и любит шить наряды на заказ.

4.Литературные вкусы “Мисс Беларусь” не самые оригинальные. Она любит творчество Пабло Коэльо. Последняя прочитанная книга — “Кризисная психология”.

5.Людмила совершенно не употребляет спиртного. Зато любит березовый сок.

6.Жительница Гродно — член Белорусского республиканского союза молодежи, хотя признается, что она *“сторонник разрешения всех конфликтов дипломатическим путем”.* И знает, кто такой Милинкевич.

7.Людмила Якимович признается, что любит танцевать даже в ущерб сну.

8.Молодого человека красавицы зовут Сергей Трошко, он занимается ресторанным бизнесом в Гродно.

9.Свой выигрыш первая красавица страны еще не держала в руках. Пока знает точно, что какую-то часть суммы потратит на благотворительность.

10.А любимое место красавицы в родном городе — парк в районе знаменитой Каложской церкви. *“Летом часто бываю в кафе “Трошкін закуток”, оно расположено в этом же парке”,* — призналась Людмила.

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

В красивой упаковке на столе возле окна гордо стоит желтая Орхидея. Ей очень уютно в своем маленький домике. Зеркальное отражение от стенок, покрытых фольгой, поддерживает необходимую влажность и дает возможность видеть свое отражение, ощущать пространство. Открытый верх позволяет свободно дышать. Стебелек Орхидеи помещен в пузырек и имеет возможность постоянно питаться водой. Орхидея не испытывает нужды. Она любуется своим отражением и сочувственно смотрит на голые, некрасивые ветки за окном. Они прижались к оконному стеклу и дрожат от малейшего ветра. После ночного холода на тоненькой веточке возле самой почки блестит льдинка. Она поймала первые лучи восходящего солнца, разложила их на цвета и показала радугу всем окружающим.

— Странно, что это у нее за украшения? — подумала Орхидея, увидев необычный отблеск. — Вероятно, очень дорогое. Зачем оно ей, такой некрасивой, вот мне бы оно подошло больше.

— Привет! — сказал лучик и окрасил стенки домика Орхидеи в радужные оттенки.

— Привет, — немного смутившись, ответила Орхидея. — Слушай, что это за украшение вон на той ветке за окном?

— Это не украшение, это награда.

— Что еще за награда? — возмутился гордый цветок.

— Награда за принятие всего, что посылается.

— Подожди, я тебя не понимаю.

— А ты будь более внимательна к тому, что видишь, и приведи в порядок свои мысли.

Орхидея молча глянула в окно. Там набухшие почки встречают весну на свободе. Свободе… тепла и холода, солнца и дождя.

Орхидея смотрела на ветку. На месте льдинки была большая капля воды. Она переливалась разными цветами и изо всех сил держалась возле самой почки. Ей так хотелось напоить почку, оживить ее своей водой.

— Вы не ограничены упаковкой, вы видите все вокруг: небо, облака, солнце, звезды. Почему я должна вот так сидеть да еще и долго жить в этой упаковке? — думала про себя Орхидея.

Она представила, как красиво бывает на улице. Как пахнет раннее утро, как Солнце протягивает первые лучи, здороваясь со всем земным существом. Через окно она видела кусочек неба. Оно было необъяснимо красивым и безграничным.

— Ты замечаешь, что снова не довольна своим положением? — заметил уходящий лучик.

— А чему тут быть довольной? Сиди под этим колпаком… — злилась Орхидея.

— Учись у этих веточек. Они не могут влиять на условия, в которых живут. Они полностью подчинены природе. Сегодня солнце — спасибо, можно расслабиться. А ночью будет очень холодно, но они и это примут. Примут все, что будет дано. А тебе повезло, о тебе заботятся люди. И воды тебе дали, и упаковку красивую сделали. Перестань ныть.

— Но… лучик, дорогой, не уходи, вразуми меня еще раз! — пыталась остановить своего учителя Орхидея.

— Ты сама все сможешь, — на прощание сказал лучик и ушел. Солнце всегда в движении, и лучи следуют ему.

— Скоро праздник, и я дарю тебе эту Орхидею.

— Спасибо! Какая она красивая! Знаешь, мы с ней похожи обстоятельствами жизни. Похожи тем, что ограничены своей упаковкой, своим восприятием свободы, а скорее всего, и хаосом своих мыслей.

— Прекрати ныть. Я еле приехал, очень скользкая дорога.

— Да, да, прости. Спасибо огромное!

Данута ЛЕБЕДЕВА.

Минск.

АФІЦЫЙНА

Пенсіянерам — скідка

Грамадзянам пенсіённага ўзросту на летні перыяд дадзена 50-працэнтная скідка ад кошту праезду на чыгуначным, водным і аўтамабільным пасажырскім транспарце агульнага карыстання рэгулярных прыгарадных зносін (акрамя таксі).

Як паведаміла прэс-служба прэзідэнта, гэта прадугледжана ўказам кіраўніка дзяржавы №204 "Аб дзяржаўнай падтрымцы пенсіянераў".

Ільгота на праезд дадзена "на перыяд сезонных сельскагаспадарчых работ — з 1 мая па 30 верасня".

СЛЫШАЛИ?

В Беларуси рассматривается возможность введения ответственности для клиентов проституток

*В Беларуси рассматривается возможность введения ответственности мужчин за использование услуг проституток, сообщил первый заместитель министра внутренних дел **Олег ПЕКАРСКИЙ**, передает БЕЛТА.*

"В Беларуси в стадии рассмотрения находится шведский вариант, когда за занятие проституцией отвечает не только женщина, но и мужчина, который пользуется этими услугами", — сказал представитель МВД. Он подчеркнул, что *"этот вопрос будет тщательно прорабатываться, так как даже не все европейские страны смотрят на это одинаково"*. Пока только Швеция решилась привлекать мужчин к ответственности за приобретение продажной любви.

Олег Пекарский также напомнил, что недавно в Беларуси было введено альтернативное наказание за занятие проституцией. Согласно Кодексу об административных правонарушениях, за это предусмотрен не только штраф, но и административный арест. *"Мы были вынуждены применить административный арест, чтобы хоть как-то повлиять на эту категорию"*, — отметил первый замминистра, пояснив, что штрафные санкции за занятие проституцией на "жриц любви" особо не действуют: суммы неоплаченных штрафов доходят до нескольких сотен долларов, так как девушки не живут дома, снимают квартиру и взыскивать не с кого. *"Их усилия решили направить хотя бы на уборку города, особенно лесополосы, куда они выходят на промысел и которая ими приводится в страшную непригодность"*, — сказал Олег Пекарский.

Небяспечныя маршруткі

У Брэсце вадзіцель маршрутнага таксі маркі "ГАЗ" адчуў сябе дрэнна і, з'ехаўшы з дарогі, урэзаўся ў сцяну шматпавярховага жылога дома.

У ДТЗ атрымалі траўмы трое пасажыраў, паведаміла БелаПАН інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе абласной ДАІ Наталля Касьянік.

Аварыя адбылася на праспекце Машэрава. Вадзіцель маршрутнага таксі №10, які ехаў ад вуліцы Маскоўскай у бок вуліцы Леніна, недалёка ад прыпынку грамадскага транспарту "МОПР" з'ехаў з дарогі, двойчы перасек тратуар і бакавыя з'езды з дарогі, пасля чаго машына ўдарылася ў сцяну шматпавярховага жылога дома. Па дарозе маршрутнае таксі сутыкнулася з двума прыпаркаванымі легкавымі аўтамабілямі, у якіх не было людзей.

У самой маршрутцы знаходзіліся 12 пасажыраў. Трое з іх атрымалі нязначныя траўмы, удары і пасля аказання медыцынскай дапамогі адпушчаны дамоў, паведаміла Касьянік.

42-гадовы вадзіцель маршруткі шпіталізаваны з дыягназам "сутаргавы сіндром".

У момант аварыі людзей на пешаходных тратуарах не было. Па гэтым факце праводзіцца праверка.

З пачатку года гэта другое ДТЗ у Брэсце з удзелам маршрутных таксі з пацярпелымі.

Ларыса ШЫГАНАВА, БелаПАН.

ПАМЯТЬ

Нас спасли, а сами погибли

Столько времени прошло, но разве такое забудешь? Хочу рассказать, как нас, троих маленьких детей, во время репрессий в предвоенные годы приютила и спасла от неминуемой гибели еврейская семья.

...В морозную февральскую ночь 1938 года на станции Верейцы Осиповичского района к бараку, где проживали семьи рабочих-железнодорожников, подошла машина. Даже и сейчас хорошо сохранился в памяти характерный тарахтящий шум работающего двигателя. Через минуту-другую в дверь нашей комнаты громко постучали. Сразу и не понять было, что произошло. В коридоре барака — шум, крики, плач. К нам вошли трое. Осветили комнату направленным лучом фонаря, громко кричали, ничего не объясняя. Отца увели. Запомнилось, что он надевал сапоги на босу ногу...

На следующий же день семью выселили из барака, выбросив все пожитки на улицу. Комнату опечатали. Куда было деваться? Близких нет. Единственное, что оставалось, отвести нас на вокзал станции Верейцы. Мама оставила детей там, а сама ушла сторожить выброшенное имущество...

Лишь в 1986 году, то есть через 48 лет после ареста, мы узнали судьбу отца: 31 июля 1938 года его расстреляли.

Бездомным, бездольным что было делать? Но нашлись добрые люди, приютили нас в соседней деревне Перерожки. На работу маму нигде не брали. Жили только тем, что у нас сохранилась швейная машинка "Зингер", а мама умела хорошо шить.

Через полгода хозяина дома, приютившего нас, постигла та же участь, что и нашего отца. Его арестовали, семью выслали. Они исчезли, растворились без следа...

Многие нас сторонились — с семьями "врагов народа" общаться было опасно. Случившееся с нами и теми, кто нас приютил, — тому наглядный пример. А нам, детям, младшему и года не было, мне — три, старшему — пять. Мать под покровом ночи, ничего не взяв с собой, повела на станцию. Потом, когда мы были уже взрослые, призналась: решила положить детей под поезд, а затем потом покончить и с собой. Утречком, в малолюдное время вывела нас на платформу. Поезд приближался. Но как справиться с тремя? Замешкалась. Прохожий железнодорожник буквально выхватил нас из-под колес. Отвели всех в здание вокзала. Мать была в обмороке...

Весть о том, что она хотела покончить с детьми, распространилась вокруг. Придя в себя, мама осознала, что могло произойти. Счастью ее не было предела, когда она увидела нас живыми и что не произошла страшная трагедия.

На вокзале нашлись люди, которые знали нашу семью, советовали уехать куда-нибудь подальше или хотя бы в местечко Лапичи, что в десяти километрах от этих мест. Там была швейная мастерская, там нужны были хорошие швеи. Это местечко в основном населяли евреи.

Приехав в Лапичи, мама попыталась сначала устроиться в колхоз, но туда ее не взяли. Обратилась в швейную мастерскую. Ей объяснили: вот если бы детей куда пристроить, то, наверное, взяли бы. Помог счастливый случай. Заведующей мастерской была женщина, которая когда-то с моей мамой училась шитью в одном месте. И теперь они быстро сошлись. Женщина предложила маме ухаживать за ее престарелой матерью в ее доме и помогать вести домашнее хозяйство. А работу над шитьем брать на дом.

Нам выделили комнату в их доме. Это было спасение! Все домашнее хозяйство стало общим, даже огород и козы. Толку от нас, детей, конечно, еще было мало, но мы уже могли пасти коз, а это уже что-то значило...

Бабушка Пиниха (так ее все звали) для нас была просто бабушкой, стала для нас как родная. В Лапичи к ней приезжал ее племянник из Речицы, Сема. Ему было в то время лет 14—15. Он был для нас как старший брат. Водил на речку, присматривал за нами. Так мы и жили одной семьей, пока не началась война. Многие считали, что мы — близкие родственники.

От заказов на шитье у мамы не было отбоя. Ухоженный огород бабушки Пинихи стал хорошим подспорьем для нашей большой общей семьи. Горе стало потихоньку сглаживаться. Как видно из фотографии, сделанной незадолго до войны, выглядим мы, дети, вполне нормально. К сожалению, о приютившей нас семье впоследствии не сохранилось никаких сведений.

Началась война. Лапичи были оккупированы. Наша, уже налаженная жизнь, была опять нарушена. Во время облавы на евреев (Сема в это время был в Лапичах) ему удалось скрыться. Выжил ли он, как сложилась его судьба, нам не известно. За несколько первых дней оккупации фашистами было ликвидировано почти все еврейское население местечка, большинство расстреляно. Сколько было этих жертв, до сих пор никто не скажет...

В последние годы уже нынешней истории в каждом районе Беларуси были изданы "Книги памяти" жертв прошедшего времени, в том числе и периода оккупации. Имя моего отца занесено в "Книгу памяти" Осиповичского района. А вот об уничтоженной еврейской общине в этой книге нет ни слова, как будто и не было там множества уничтоженных мирных жителей. По рассказам старожилов, уничтожено было около сотни. Почему же все это забыто? Нигде нет в Лапичах ни мемориала, ни памятной плиты. Не указаны места расстрела и захоронений. Еврейское кладбище, которое там было, стерто с лица земли. На его месте сейчас пустырь. Нынешнему поколению Лапичей ничего не известно о тех трагических событиях. Лишь одно скромное захоронение жертв войны находится в шести километрах от местечка в глухом малолюдном месте. Там указано только несколько еврейских фамилий. Как же так — человеческие судьбы в наше время уходят в беспамятство?

Близится знаменательная дата — 65-летие Великой Победы над фашизмом. Надо вспомнить всех, кто не дожил до нынешних дней, чьи жизни забрала война. Новому поколению необходимо знать о трагической гибели еврейской общины в Лапичах. Желательно, чтобы "Книга памяти" Осиповичского района была дополнена этими сведениями. Нельзя допустить, чтобы это было забыто!

Александр Эдуардович ВАРАКСА, минчанин.

Единственная фотография предвоенных лет (местечко Лапичи).

ВІНШУЕМ!

Шчодрыя вёрсты

Уладзімір ЛІПСКІ

6 мая спаўняецца 70 гадоў вядомаму беларускаму пісьменніку і грамадскаму дзеячу, старшыні праўлення Беларускага дзіцячага фонду, галоўнаму рэдактару часопіса "Вясёлка", лаўрэату Дзяржаўнай прэміі Беларусі Уладзіміру Ліпскаму.

Уладзімір Сцяпанавіч Ліпскі нарадзіўся ў вёсцы Шоўкавічы Рэчыцкага раёна. Скончыў Мінскі тэхнікум харчовай прамысловасці і аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працаваў на Гарадзейскім цукровым заводзе, быў на прафсаюзнай і камсамольскай рабоце, адказным сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Ён аўтар звыш шасцідзесяці кніг. Сярод іх — "Крутыя вёрсты" (пра Героя Савецкага Саюза Зінаіду Тусналобаву-Марчанка), "Урокі Купрэвіча" (пра прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі), "Басанож на зорках" (пра Ігара Лучанка), "Нарачанская чайка" (пра народную артыстку Беларусі Марыю Захарэвіч), "Янкаў вянок" (дзецям пра Янку Купалу). Шырокі рэзананс набылі кнігі Ул.Ліпскага "Жыві сёння", "Бацькі і дзеці", "Падкідыш", якія прасякнуты болем і трывогай за лёсы дзяцей.

Пісьменнік першым у беларускай літаратуры расказаў пра свой радавод ("Я. Праўдзівы аповед пра твой і мой радавод"), дапоўніўшы яго асобнымі кнігамі пра самых дарагіх для яго людзей ("Мама. Малітва сына" і "Бацька. Пісьмы на неба").

Сапраўдным падарункам дзецям сталі яго кнігі "Антоніко-понік", "Вясёлая азбука", "Каралева белых прынцэс", "Наша Маша", "Прыгоды Нуліка", "Я тут жыву", "Свіцязянская русалка" і іншыя.

Уладзімір Ліпскі з'яўляецца ініцыятарам і нязменным старшынёй журы Усебеларускіх фестываляў народнага гумару ў Аўцюках, якія далі штуршок для правядзення падобных рэгіянальных святаў у Спораве Бярозаўскага, Дубіна Валожынскага і Баянічах Любанскага раёнаў. Аж пяць кніг склаў сабраны ім гумар аўцюкоўцаў.

Кнігі Ул.Ліпскага выдаваліся на рускай, украінскай, літоўскай і нямецкай мовах, а яго літаратурная і грамадская дзейнасць адзначана міжнароднай прэміяй імя Альберта Швейцара, расійскай літаратурнай прэміяй імя Аляксандра Грына, прэміяй імя Янкі Маўра і Васіля Віткі. Пісьменнік узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны і ордэнам святога царэвіча Дзімітрыя, з'яўляецца ганаровым грамадзянінам Калінкавіцкага раёна. Шчодрыя жыццёвыя вёрсты ў знанага пісьменніка!

Юбілейны вечар, прысвечаны 70-годдзю Уладзіміра Сцяпанавіча Ліпскага, адбудзецца 14 мая 2010 года ў Вялікай зале Белдзяржфілармоніі.

Тэл. для даведак: 204-62-83, 8-029-111-86-32 РАДЗІКЕВІЧ Анастасія Віктараўна.

ИНИЦИАТИВА

Леонид Козик предлагает взимать налог с бездетных мужчин

Глава официального профсоюза считает, что такой мерой можно будет стимулировать рождаемость.

"Когда-то такая практика уже применялась. Надо к этому вернуться, — считает лидер ФПБ. — Это и пополнение бюджета, и своеобразный, достаточно веский стимул для тех представителей сильного пола, которые уходят от своей гражданской обязанности. При этом, если рождается первый ребенок, налог должен быть снижен на 50%. При рождении второго — налог отменяется. Родился третий — государство возвращает весь уплаченный ранее налог".

МАЛАВЯДОМЫЯ ФАКТЫ ВАЙНЫ

Ішлі на таран…

Першы начны налёт на Маскву Люфтвафэ быў 22 ліпеня 1941 года, у ім удзельнічалі бамбардзіроўшчыкі Ю-88, Хе-111, До-217. Не ўсім ім удалося прарвацца скрозь даволі шчыльную заслону зенітнага агню. Да ўсяго на прысталічных аэрадромах базіравалася звыш 700 самалётаў-знішчальнікаў, і яны таксама, хоць і не многія, узнімаліся ў начное неба.

Сярод пілотаў быў і малодшы лейтэнант Віктар Талаліхін. У ноч на 8 жніўня на сваім І-16 ён атакаваў нямецкі Ю-88, расстраляў усе патроны, але збіць не змог. Тады пайшоў на таран і вінтом "ішачка" адсек хвост Ю-88. Той заваліўся і ўпаў на зямлю, а Віктар Талаліхін, пакінуўшы пашкоджаны знішчальнік, спусціўся на парашуце.

Зорку Героя Савецкага Саюза ў Крамлі яму ўручаў Міхаіл Калінін. Яго партрэты абышлі ўсе франтавыя газеты. І мала хто тады ведаў, што яшчэ ў першы ж дзень вайны, 22 чэрвеня, нашы лётчыкі 21 (!) раз ішлі на таран, і 16 з іх загінулі разам з пашкоджанымі машынамі...

Першы таран у 4 гадзіны 15 хвілін раніцы таго першага дня супраць нямецкага двухматорнага знішчальніка Ме-110 на новым знішчальніку МіГ-3 здзейсніў малодшы лейтэнант Дзмітрый Кокараў. Расстраляўшы патроны з трох кулямётаў, ён рубануў вінтом па стабілізатары Ме-110 — і той, заваліўшыся ў штопар, упаў на зямлю. А сваю машыну з пагнутым вінтом Віктар Кокараў пасадзіў на фюзеляж. Пазней ён пад Ленінградам збіў два нямецкія самалёты.

На дзесяць хвілін пазней Кокарава, у 4 гадзіны 25 хвілін першага дня вайны лейтэнант Іван Іваноў са звяном знішчальнікаў І-16 вылецеў на перахоп 6 нямецкіх бамбардзіроўшчыкаў Хе-111, якія набліжаліся да нашага аэрадрома. Збілі адзін, астатнія павярнулі назад. Іваноў пагнаўся за крайнім, расстраляў усе патроны з чатырох кулямётаў, а вораг працягваў палёт — і авіятар пайшоў на таран. Ад удару ў хвост Хе-111 той крута пайшоў уніз і ўзарваўся на сваіх бомбах. Іванову ўдалося пасадзіць свой пашкоджаны І-16 на зямлю, але нямецкі бартавы стралок усё ж параніў яго, і лётчык па шляху да шпіталя памёр. 2 жніўня 1941 года яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Усяго за першыя 8 дзён вайны савецкія лётчыкі-знішчальнікі здзейснілі 107 таранаў!

Чытач можа спытаць, адкуль такія звесткі, раней аб іх не ўпаміналася, акрамя як пра таран таго ж Віктара Талаліхіна? Абнародаваны яны і іншыя шматлікія факты паветраных таранаў у кнізе "Иду на таран!", якая выйшла ў 2007 годзе ў Маскве ў выдавецтве "Яуза". Аўтары яе — ваенныя гісторыкі Міхаіл Жарохаў і Аляксандр Катлабоўскі. Напісана яна на грунце шматлікіх крыніц і сведчанняў непасрэдных удзельнікаў таранаў, да апошняга часу практычна амаль невядомых, у тым ліку і ветэранам вайны. Як засведчылі аўтары, у 1941—1942 годах савецкімі лётчыкамі было здзейснена каля 400 таранаў. У асноўным пасля таго, як у іх знішчальнікаў заканчваліся патроны да кулямётаў ШКАС калібру 7,62 міліметра — імі былі ўзброены І-16, І-153, нават МіГ-3, хоць у апошняга быў на ўзбраенні і адзін буйнакаліберны 12,7 міліметра. Збіць імі тыя ж Ю-88, Хе-111, якія неслі 6—7 кулямётаў і па адной 20-міліметровай гармаце, было вельмі цяжка. Вось і секлі варожым машынам хвасты, рызыкуючы сваім жыццём і фактычна губячы свой самалёт.

Пры з'яўленні на франтах новых, узброеных 20-міліметровай гарматай і буйнакаліберным кулямётам знішчальнікаў Як-1, Як-7, Ла-5, амерыканскай "Аэракобры", узброенай 37-міліметровай гарматай і шасцю кулямётамі, тараны сталі радзейшыя. За 1943—1944 гады іх было зафіксавана не больш за 200.

Няхай не падумае чытач, што лётчыкі мелі загад на таран — яго не было. Усё вырашаў сам пілот, гледзячы на сітуацыю ў небе. Таран — узор цвёрдасці і адвагі духу пілота, які рашыўся на такі крок, ведаючы, што ён можа стаць ракавым для яго.

Пры падрыхтоўцы да выдання гэтай кнігі аўтары выкарысталі не толькі свае, але і нямецкія архівы, бо ў Люфтвафэ кожны выпадак гібелі іх самалётаў пры таране савецкімі знішчальнікамі дэталёва быў зафіксаваны. Дарэчы, у свой час некаторыя нашы ваеначальнікі лічылі, што нямецкія пілоты не ішлі на таран з-за сваёй нерашучасці, боязі загінуць. Але гэта не зусім так — у знішчальніка Ме-109, самым масавым, у Фв-190 было на ўзбраенні: у першым — дзве гарматы 20 мм калібру і два буйнакаліберныя кулямёты, у другога Фв-190 — чатыры гарматы 20 мм і два кулямёты 7,7 міліметра. Таму часта выйгрыш у паветранай сутычцы з нашымі самалётамі быў на іх баку, асабліва калі немцы нападалі на не прыкрытыя знішчальнікамі нашы штурмавікі Іл-2 ці пікіруючыя бамбардзіроўшчыкі Пе-2. І тым не менш: у 1941 годзе немцы здзейснілі 2 тараны, у 1942—1943 гадах — 9, у 1944—1945 гадах — 2. Апошні — у канцы красавіка 1945 года ў небе над Берлінам, калі Фв-190 збіў нашага Як-9, а другога пратараніў і пры пасадцы на скалечанай машыне быў паранены, трапіў у палон савецкім салдатам.

Былі тараны і ў небе Беларусі летам 1944 года. Пад Віцебскам старшы лейтэнант Аляксандр Гудзілін на Як-7 пайшоў на Фв-190 і вінтом зрэзаў таму хвост, але і яго машына пацярпела. Гудзілін на парашуце спусціўся да партызан. Каля Ляхавічаў у ліпені 1944 года лейтэнант Мікалай Папоў на знішчальніку Ла-5 тараніў нямецкі бамбардзіроўшчык Ю-87, а 17 жніўня таго года лейтэнант Уладзімір Сямёнаў на знішчальніку Ла-7, узброеным 3 гарматамі 20 мм, вяртаючыся з разведвальнага палёту, зблізіўся на вышыні 5000 метраў з двухматорным нямецкім бамбардзіроўшчыкам Ю-88 і мог расстраляць яго з трох ствалоў, але чамусьці пайшоў на таран і левым крылом зрэзаў немцу кіль, і Ю-88 заваліўся ў глыбокі штопар. Сямёнаў мусіў пакінуць пашкоджаны самалёт на парашуце.

Таран паблізу Берліна здзейсніў 17 красавіка 1945 года на сваім Ла-5 гвардыі капітан, Герой Савецкага Саюза Віталь Папкоў. Ён збіў адзін Фв-190, другому крылом зрэзаў каўпак над кабінай нямецкага пілота, які паспеў пакінуць сваю машыну. Але і наш ястрабок ад удару перакуліўся і хвастом упаў у балота. Пілот ацалеў, хоць і меў раненні.

Толькі ў апошнія гады, зазначаюць аўтары кнігі, пачаліся работы па зверцы звестак аб таранах. На яе апошніх старонках яны змясцілі прозвішчы, даты таранаў усімі 600 савецкімі пілотамі-знішчальнікамі. Амаль трэць іх уключаны ў спіс загінуўшых… Мы павінны ведаць і помніць герояў.

Міхаіл ТЫЧЫНА, ветэран Вялікай Айчыннай вайны.

МАЗАІКА

Апусціліся

У новым рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі футбола зборная Беларусі апусцілася з 80-га на 81-е месца, а колькасць набраных ёю ачкоў паменшылася з 404 да 397.

У еўрапейскім рэйтынгу падапечныя Бернда Штанге перамясціліся з 39-й на 40-ю пазіцыю сярод 53 зборных. Сярод нацыянальных каманд краін былога СССР Беларусь ідзе пятай пасля Расіі, Украіны, Латвіі і Літвы.

Лепшым для беларускай зборнай з'яўляецца 57-е месца ў сусветным рэйтынгу ў чэрвені — верасні 2008 года.

Усяго ў рэйтынг уключана 207 зборных.

Міхаіл Захараў прыжыўся ва Украіне?

Беларускі хакейны трэнер Міхаіл Захараў гатовы і надалей працаваць са зборнай Украіны, якую сёлета не змог вывесці ў топ-дывізіён чэмпіянату свету. Пра гэта паведамляе сайт Федэрацыі хакея Украіны.

"Калі б выканкам федэрацыі прапанаваў мне прадоўжыць працаваць з камандай, я ахвотна пагадзіўся б", — заявіў Захараў на прэс-канферэнцыі ў Кіеве па выніках выступлення ў галандскім Цілбургу на сусветным першынстве ў групе А першага дывізіёна.

Паводле слоў прэзідэнта ФХУ Анатоля Брэзвіна, у выпадку выхаду каманды ў эліту федэрацыя "адразу ж працягнула б кантракт з беларускім спецыялістам". "Не выключана, што Міхаіл Міхайлавіч прадоўжыць працаваць з камандай. Але ў любым выпадку далейшы лёс трэнерскага штаба будзе вырашаць бліжэйшы выканкам федэрацыі", — сказаў Брэзвін.

Мезін застаўся

Галкіпер беларускай хакейнай зборнай Андрэй Мезін прадоўжыць падрыхтоўку да чэмпіянату свету ў Германіі, паведаміла прэс-служба Федэрацыі хакея Беларусі.

Мезін вярнуўся з Кіева пасля дзесяцідзённай адлучкі ад сям'і. Хакеіст быў незадаволены стаўленнем з боку мінскага "Дынама" пры разглядзе пытання аб заключэнні новага кантракта.

Паводле слоў галоўнага трэнера зборнай Эдуарда Занкаўца, Мезін быў засмучаны тым, як да яго ставіцца мінскае "Дынама". Як заявіў кіраўнік БФСТ "Дынама" Юрый Бародзіч, Мезін — "безумоўна, выдатны ігрок, спартыўная біяграфія і цяперашні статус якога даюць падставы ўважліва ставіцца да заключэння (працягу) кантракта". "Разам з тым гэтаму не супярэчыць раней агучаная пазіцыя, што нароўні з кандыдатурай Андрэя разглядаюцца і іншыя варыянты, — сказаў Бародзіч. — Канчатковае рашэнне па Мезіну будзе залежаць у тым ліку і ад яго выступлення на сусветным чэмпіянаце ў Германіі".

Рыхтуй сані летам

Падрыхтоўка Беларусі да чэмпіянату свету па хакеі 2014 года была абмеркавана ў Мінску на сустрэчы старшыні Федэрацыі хакея Яўгена Ворсіна і члена Савета Міжнароднай федэрацыі хакея Эрнэста Альянчыча.

Паводле інфармацыі прэс-службы ФХРБ, Альянчыч рэкамендаваў стварыць спецыяльную структуру па-за штатам федэрацыі, якая мела б свой бюджэт і займалася непасрэдна арганізацыяй чэмпіянату.

Апрача таго, Альянчыч, у мэтах падрыхтоўкі да ЧС-2014 прапанаваў думаць аб правядзенні ў Беларусі ў хуткім часе яшчэ аднаго буйнога міжнароднага турніру. Паводле слоў Ворсіна, ФХРБ разглядае магчымасць правядзення маладзёжнага чэмпіянату свету ў першым дывізіёне, які адбудзецца ў снежні 2010 года, паведамляе БелаПАН.

ШАХМАТЫ

«Браво, сеньор Купрейчик!..»

XXI век совсем не случайно называют веком страстей и скоростей. Даже неспешная древняя игра под названием "шахматы" в последние годы тоже попала в разряд скоростных видов спорта: чемпионаты и супертурниры самого высокого ранга либо начинаются с "рапида" (быстрых шахмат), либо завершаются серией блиц-партий "пятиминуток". Вот и в матче на первенство мира между Виши Анандом (Индия) и Веселином Топаловым (Болгария), который проходит в Софии, в случае ничейного счета после 12 поединков регламент предусматривает тай-брейк из четырех 25-минуток, хотя на финише не исключены и блиц-партии.

Но сегодняшний наш разговор о чемпионате Европы среди сеньоров (шахматистов старше 60 лет), недавно завершившемся в греческих Салониках, где международный гроссмейстер из Минска Виктор Купрейчик завоевал сразу два титула — стал чемпионом Старого Света по быстрым шахматам и вице-чемпионом по шахматам с классическим контролем времени.

Уже через двое суток после возвращения в Минск Виктор Купрейчик отъезжал в Германию на очередной турнир. Во избежание передряг из-за вулканического пепла он предпочел на этот раз не самолет, а скорый поезд "Москва—Берлин", и наша встреча проходила в зале ожидания железнодорожного вокзала. Именно по этой причине беседа с гроссмейстером напоминала блиц-партию.

— Как настроение, сеньор Купрейчик?

— По-спортивному боевое. Конечно же, весеннее. Правда, переменчивое...

— Из-за капризной погоды?

— Не только. Так всегда бывает во время короткого затишья между боями...

— Затишье в самом деле короткое: едва завершился чемпионат в Греции, а на очереди — турнир в Германии. Тебе, Виктор, уже за 60. Многие твои ровесники покинули шахматную сцену, а ты все играешь и играешь. Не устаешь?

— Передвигать по доске в черно-белую клеточку коней и слонов, принимать поздравления с победами я еще не устал (*улыбается*). Шахматы — это мой мир. Не дом, а именно мир.

— Давай мысленно вернемся в греческие Салоники...

— Этот древний город стал для меня в апреле счастливым. Я выиграл чемпионат по "рапиду" среди сеньоров, опередил главных соперников — гроссмейстеров Альгимантаса Бутнорюса из Литвы и двух россиян — Виталия Цешковского и Николая Пушкова. Практически без передышки там же, в Салониках, в клубе "Галаксия" снова сел за шахматный столик уже в рамках чемпионата Старого Света по классическим шахматам. Набрал 6,5 очка в 9 турах (4 победы и 5 ничьих) и завоевал серебряную медаль. Виталий Цешковский опередил меня на полочка, он — победитель. "Бронза" досталась гроссмейстеру Геннадию Тимощенко — уроженцу Новосибирска, избравшему местом жительства Словакию.

— Твои результаты на двух сеньорских чемпионатах впечатляют: 9 побед, 9 ничьих и ни одного поражения! Это нечто новенькое в твоей шахматной карьере. Раньше ты играл без оглядки, шел ва-банк во имя победы, игнорируя "беззубые ничьи", и с легкой руки чемпиона мира Михаила Таля тебя стали называть "шахматным д'Артаньяном".

— Был молодым, азартным. А с возрастом, как видишь, стал осмотрительнее. С головой в омут не бросаюсь...

— И все-таки с трудом верится, что два некогда непримиримых дуэлянта — Купрейчик и Цешковский, в очных поединках всегда сражавшихся до последнего пехотинца, в Салониках обе партии завершили миром. Но такое случилось. В чем дело?

— Подобный вопрос нам с Виталием задавали греческие шахматные обозреватели. Я отшутился строкой Александра Пушкина: "Пора, мой друг, пора! Покоя сердце просит..."

— Выходит, что ты изменил своему девизу: "Шпагу в руки и — вперед!".

— Не изменил, а только подкорректировал игру с поправкой на возраст. Получается атака — атакую. В Салониках, к слову, мне вручили приз "За самую красивую партию".

— Теперь с Виталием Цешковским, двукратным чемпионом СССР, вы — шахматные сеньоры. А кто сеньора?

— Сеньора — Тамара Кмидашвили из Грузии. Раньше поклонники древней игры знали ее по девичьей фамилии — Хугашвили. Россиянка Елена Фаталибекова стала вице-чемпионкой. А Нона Гаприндашвили поделила места с третьего по пятое.

— Ужель та самая Нона, которая...

— Да, та самая, которая без малого полвека (!) назад стала чемпионкой мира и удерживала шахматную корону на протяжении 16 лет — с 1962-го по 1978 год.

— Чем еще запомнился тебе чемпионат в Греции?

— Были сюрпризы. Подходит главный арбитр Джерри Уолш и говорит: "Сеньор Купрейчик, а вы не запамятовали, что в 1974 году я был судьей на Всемирной студенческой олимпиаде в английском городе Тиссайд, а вы стали тогда чемпионом мира в составе сборной команды Советского Союза?" "Конечно, помню", — ответил я. Согласитесь: такая встреча через 36 лет как ностальгическое возвращение в молодость...

— В Грецию на чемпионат Европы приезжали гроссмейстеры и мастера из 17 стран.

— Среди 36 соискателей наград, кроме меня, были еще два белоруса: профессор математики Александр Кулаго и Алексей Савенюк из Бреста. Первый сейчас живет в Москве, он выступал за Россию и занял 16-е место в "классике", а второй — представлял Беларусь. Его итоговое место — 26-е. Пользуясь случаем, хочу сказать: и сама поездка в Салоники, и мои победы были бы проблематичными без финансовой поддержки со стороны Белорусской федерации шахмат и без поддержки моральной со стороны друзей — поклонников древней игры.

— И напоследок, Виктор, о ближайших планах...

— Планы такие. Летом, возможно, сыграю на Международном турнире "Minsk open 2010", а в сентябре предстоит поездка в российский Ханты-Мансийск на Всемирную шахматную олимпиаду, правда, там я буду выступать в роли капитана мужской сборной гроссмейстеров Беларуси.

Иосиф КАЛЮТА.

ШАШКІ

Трыумф у Эстоніі

У Таліне адбылося першынства Еўропы па міжнародных шашках. Зборныя Беларусі выступілі ў іх трыумфальна: Анатоль Гантварг, Яўген Ватуцін і Андрэй Толчыкаў фінішавалі першымі ў мужчынскім турніры, Ірына Пашкевіч і Вольга Федаровіч — другімі ў жаночым.

— Атрымалася так, што ў нас былі ігракі рознага ўзросту, маладосць і вопыт дапаўнялі адно аднаго, — расказвае А.Гантварг, чатырохразовы чэмпіён свету. — Хачу адзначыць таксама і высокі ўзровень прафесійнага падыходу кожнага іграка з нашых каманд. Расія і Галандыя бачыліся фаварытамі, але мы не пакінулі сапернікам ніякіх шанцаў.

Дамінаванне моладзі

У чэмпіянаце краіны па шашках сярод жанчын, як і па шахматах, дамінавалі юныя таленты: чэмпіёнкай стала Настасся Барышава (Мінск), віцэ-чэмпіёнкай — школьніца з Бабруйска Вера Хвашчынская. Яны апярэдзілі неаднаразовую чэмпіёнку Беларусі, майстра спорту Марыну Навіцкую (Мар'іна Горка), якой дастаўся толькі бронзавы медаль. Чацвёртае і пятае месцы занялі майстар Кацярына Шпакава (Віцебск) і кандыдат у майстры спорту Алена Кірылава (Слонім). Гэтая пяцёрка захавала месцы ў вышэйшай лізе на будучы год.

У рамках нашага **бліца-70/2** пазнаёмцеся, як жанчыны гуляюць у рускія шашкі.



Белыя (А.Гарлатава): b2, c1, c3, d4, e1, e3, f2, f4, g1, h2 (10). **Чорныя** (А.Стасючонак): b6, b8, c7, d6, d8, f8, g5, g7, h4, h6 (10). Белыя вырашылі атакаваць 1. fg3. Аднак пралічыліся. З-за чаго?

З пошты рэдакцыі

Гросмайстар СССР Леанід Вітошкін (Гомель) і нацыянальны майстар Пётр Шклудаў (Наваполацк) даслалі на наш адрас свае новыя кампазіцыі на 100-клетачнай дошцы — першую і другую адпаведна:

1.**Белыя**: 23, 32, 39, 41, 43, 44, 47 (7). **Чорныя**: 8, 9, 20, 28, 30, 36 (6). Выйгрыш.

2.**Белыя**: 24, 28, 32, 33, 36, 39, 49 (7). **Чорныя**: 7, 15, 17, 21, 22, 29, 45 (7). Легальнасць пачатковай расстаноўкі лёгка даказваецца. Таксама перамога белых.

Мініяцюры прапануем развязаць у якасці заданняў **бліца-69/3 і 4**.

***

Чакаем адказы на працягу двух тыдняў па адрасе: **220030, Мінск, вул. Энгельса, 34а, рэдакцыя газеты "Народная Воля", рубрыка "Шашкі".**

Самаправерка

Класіфікацыйны-22 (Д. Камчыцкі): **№15** — g5, f4, g3, e3, a7, b8, g5 (c3) c1x; **№16** — c7 (c3) b4 (a5) a3, b4, f8, g5, a7x.

Бліц- 68/6 (І.Вальтэр): b4 (e1A) fg7, c5, g5, a5, e1#. A(c3) b2, f6-g5, c7, fe5, a7, f2 (f4B) hg3, g1#. B(h4) hg3#.

Бліц-69/1 (Л.Вітошкін): 29, 9, 4, 47x.

Мікалай ГЛАДКІ.

Где вы, депутат Плющенко?

Законодательное собрание Санкт-Петербурга попросило лидера партии "Справедливая Россия", председателя Совета Федерации Сергея Миронова отозвать фигуриста Евгения Плющенко из петербургского парламента.

В обращении депутатов говорится, что из 123 заседаний, которые Законодательное собрание провело с весны 2007 года, Плющенко присутствовал только на 11. Причем в 2009 году он посетил только два заседания, а в 2010 году — ни одного. Депутаты требуют, чтобы Миронов заставил фигуриста работать в парламенте эффективно, либо убедил его отказаться от статуса депутата.

Между тем в марте 2010 года Законодательное собрание Санкт-Петербурга объявило о намерении представить Плющенко к ордену "За заслуги перед Отечеством" IV степени. Таким образом депутаты хотят наградить фигуриста за получение серебряной медали на Олимпиаде в Ванкувере.

ПО ПОВОДУ

Для кого играем?..

Первые матчи чемпионата Беларуси по футболу, к сожалению, показали, что многие игры, как и прежде, проходят при полупустых трибунах...

А как хочется, чтобы каждый футбольный матч на стадионах страны проходил в ореоле спортивного праздника! Чтобы болельщики приходили на стадионы и уходили со светлыми и радостными лицами.

А это зависит, как я убедился за долгие годы работы на минском стадионе "Динамо", не только от победы любимой команды, но, если можно так выразиться, и от околоспортивного "гарнира"... Чем он разнообразнее, тем лучше!

Что имею в виду? Во-первых, наше телевидение и радио должны гостеприимно приглашать зрителей на матчи чемпионата страны, указывая не только число и время начала игры, но и, кратко рассказывая о встречающихся командах и их "звездочках", если, конечно, такие имеются. Во-вторых, встречать болельщиков незаслуженно забытым футбольным гимном. Мне думается, что наши поэты и композиторы способны написать футбольный гимн для страны. Пускай бы Ассоциация "Белорусская федерация футбола" проявила инициативу, и тогда, надеюсь, чиновники в связке с творческими людьми успешно решили бы эту задачу. А пока суть да дело, пусть встречают болельщиков сводные оркестры Вооруженных сил, МВД, МЧС и так далее. Подняли бы настроение болельщикам и выступления наших эстрадных артистов, а также показательные выступления юных спортсменов. В-третьих, здорово было бы приглашать для выступления перед болельщиками наших прославленных и любимых мастеров футбола. А почему бы и нет?..

Конечно, это только мои пожелания... Возможно, на это нет денег, никто не захочет этим заниматься. Но я знаю одно: встречать и провожать болельщиков нужно, как хороший хозяин принимает дорогих гостей. Вот тогда, уверен, и трибуны будут не полупустые. И сам по себе исчезнет вопрос: "Для кого играем, господа?".

Юрий ЯСИНСКИЙ, ветеран спорта, заслуженный тренер БССР.

ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ

Уладзімір КОПАЦЬ:

«Што буду рабіць далей? Жыць!..»

Як стала вядома, аўтар гістарычнай шайбы ў вароты зборнай Швецыі на Алімпіядзе ў Солт-Лейк-Сіці абаронца Уладзімір Копаць прыняў рашэнне завяршыць кар'еру прафесійнага іграка.

— Так, я закончыў з вялікім хакеем, — расказаў Уладзімір "Спортивной панораме". — Гэта канчатковае рашэнне. Я дарослы чалавек, таму нейкія спробы адгаварыць мяне былі б недарэчнымі. Гульня па-ранейшаму дастаўляе мне асалоду, але, на жаль, непакояць траўмы. Што буду рабіць далей? Жыць! Пакуль не ведаю, ці застануся ў хакеі альбу пачну займацца нечым іншым. Трэба крыху адпачыць.



Нагадаем, што апошнія сезоны Уладзімір Копаць выступаў за хакейны клуб "Гомель". Але, натуральна, стаў вядомы на ўвесь свет пасля сваёй бліскучага закінутай шайбы ў вароты зборнай Швецыі на Алімпіядзе-2002, калі зборная Беларусі перамагла скандынаваў і выйшла ў паўфінал алімпійскага турніру.

"Цудам стаў пераможны гол, які забіў Уладзімір Копаць з-за сіняй лініі за 2 хвіліны і 24 секунды да фінальнай сірэны, — пісалі тады газеты. — *Алімпійскі чэмпіён Лілехамера-1994 вратар Томі Сало хацеў плячом адбіць шайбу, якая ляцела высока, але яна патрапіла галкіперу ў шлем і закацілася ў вароты. І, натуральна, менавіта з-за гэтага шведскі галкіпер стаў "козлом отпущения". Гэтая шайба выбіла з барацьбы зборную Швецыі. Магчыма, лепшую зборную Швецыі ўсіх часоў — з Лідстрэмам, Нэслундам, Нэландэрам, Альфрэдсанам, Рэнбергам і Хольмстрэмам..."*

Дарэчы, у глабальным рэйтынгу, які Міжнародная федэрацыя хакея падрыхтавала да свайго стогадовага юбілею, гол Уладзіміра Копаця сярод сотні "цудаў на лёдзе" заняў ганаровае 28-е месца.

Адным словам, будзе што ўспомніць і дзецям расказаць...

Алесь СІВЫ.

ФУТБОЛ

«Партызан» пайшоў у «падполле»

У мінулыя выхадныя адбыліся матчы 7-га тура Нацыянальнага чэмпіянату Беларусі па футболе. Вось іх вынікі: "Нёман" (Гродна) — "Белшына" (Бабруйск) — 2:2, "Нафтан" (Наваполацк) — "Тарпеда" (Жодзіна) — 1:1. "Партызан" (Мінск) — "Дынама" (Брэст) — 0:3, "Віцебск" — БАТЭ (Барысаў) — 0:0, "Мінск" — "Шахцёр" (Салігорск) — 0:2, "Днепр" (Магілёў) — "Дынама" (Мінск) — 0:1.

Турнірнае становішча пасля 7-га тура

Каманды	Г	В	Н	П	М	А
1. БАТЭ	7	4	3	0	11-0	15
2. Белшына	7	4	1	2	7-7	13
3. Дынама (Бр)	7	3	3	1	9-5	12
4. Дынама (Мн)	7	3	2	2	6-4	11
5. Віцебск	7	2	5	0	9-5	11
6. Мінск	7	3	1	3	7-7	10
7. Шахцёр	7	2	4	1	6-4	10
8. Нафтан	7	2	3	2	9-7	9
9. Днепр	7	2	3	2	6-8	9
10. Тарпеда	7	1	2	4	8-10	5
11. Нёман	7	0	5	2	2-5	5
12. Партызан	7	0	0	7	0-18	0

Наступны тур адбудзецца ў пятніцу, 7 мая.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Улетели и стрелы, и лук...

Неизвестные преступники похитили луки и стрелы у польских спортсменов-лучников, прибывших во Львов на соревнования "Олимпийские надежды", сообщает ИА "Украинские новости" со ссылкой на представителя областного управления МВД.

По его словам, спортсмены поселились в общежитии, а свой инвентарь оставили в автобусе, водитель которого отказался парковаться на платной стоянке.

Утром поляки обнаружили, что автобус взломан, а шесть луков, более сотни стрел и два ящика с инструментами похищены. Стоимость украденного имущества они оценили в 15 тысяч евро.

В милиции пообещали раскрыть дело, следствие уже началось.

Без объяснения причин

Иск футболистов сборной России братьев Алексея и Василия Березуцких к программе "Человек и закон" и ее ведущему Алексею Пиманову отклонен, сообщает РИА "Новости".

Братья Березуцкие требовали опровергнуть информацию, которая была показана в сюжете программы "Человек и закон", посвященному тому, как футболисты сборной России нарушали режим во время подготовки к стыковым матчам со Словенией за право сыграть на чемпионате мира 2010 года. Размер компенсации спортсмены оценили в символическую сумму в 200 рублей.

В частности, в сюжете говорилось о том, что футболисты сборной выпивали и курили кальян. Один из сотрудников гостиницы Marriott, где проживали игроки, рассказал, что братья Березуцкие проводили время с женщинами.

По каким причинам иск братьев Березуцких был отклонен, не уточняется.

Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а. Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871. Тэл./факс рэкламнага аддзела: (017) 3286904, 3286906 E-mail : nv@promedia.by http://www.nv-online.by

ISSN 2071-9647

Падпісныя індэксы: 63222,632222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродка масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 3.05.2010 у 18.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 21020 экз. Заказ №2101.